ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№ 10 (1003) | АЎТОРАК, 22 мая 2001 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## ПАВІНШАВАЛІ ЛАЎРЭАТА ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ

7-га мая ў Палацы Рэспублікі Прэзідэнт краіны А.Р. Лукашэнка ўручыў Дзяржаўныя прэміі Беларусі 2000 года за дасягненні ў галіне навукі і тэхнікі, літаратуры, мастацтва і архітэктуры, цёпла павіншаваў лаўрэатаў з ганаровымі ўзнагародамі.

За лепшы падручнік Дзяржаўную прэмію атрымаў загадчык кафедры педагогікі нашага універсітэта, доктар педагагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі БССР, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі І.Ф.Харламаў. Прыняўшы з рук Прэзідэнта высокую ўзнагароду, Іван Фёдаравіч з удзячнымі словамі за яе даў інтэрв'ю першым дзяржаўным праграмам беларускага тэлебачання і радыё.

З нагоды ўручэння акадэміку І.Ф.Харламаву Дзяржаўнай прэміі Беларусі цёпла ўшанавалі лаўрэата на рэктараце. У яго адрас прагучалі шчырыя віншаванні і найлепшыя пажаданні ад рэктара члена Савета Рэспублікі прафесара М.В.Селькіна, ганаровага рэктара ГДУ члена-карэспандэнта НАНБ Л.А.Шамяткова, першага прарэктара дацэнта А.П.Кармазіна, прарэктара па навуковай рабоце прафесара Д.Р.Ліна, прарэктара па вучэбнай рабоце прафесара А.Ф. Каморнікава, прарэктараў А.В. Лысянкова, П.М.Навуменкі, старшыні прафкама Г.І.Варатніцкага, рэдактара газеты "Гомельскі універсітэт" У.П.Балогі.

У адказным слове І.Ф.Харламаў паабяцаў працягваць работу над далейшым удасканаленнем падручніка "Педагогіка", які ўдастоены Дзяржаўнай прэміі, па-ранейшаму спаўна перадаваць свае багатыя веды будучым маладым спецыялістам, спрыяць разумнай перабудове адукацыі.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

## УСТУПНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ ЗНОЎ ПАД КАНТРОЛЕМ

Для абітурыентаў, якія будуць паступаць сёлета ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы нашай краіны, хутка пачнецца гарачая экзаменацыйная пара. Праблемам, што звязаны з ажыццяўленнем кантролю за ходам уступных выпрабаванняў у дзяржаўныя навучальныя ўстановы, была прысвечана спецыяльная нарада. 4 мая яе правёў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка. Удзельнікамі абмеркавання важных пытанняў былі прадстаўнікі Савета Міністраў, Адміністрацыі Прэзідэнта, рэктары ВНУ і кіраўнікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, а таксама кіраўнікі мясцовых структур улады. У рабоце нарады прыняў удзел і рэктар нашага універсітэта член Савета Рэспублікі прафесар М.В.Селькін.

На нарадзе былі грунтоўна абмеркаваны пытанні, звязаныя з правядзеннем уступных экзаменаў, захаваннем мэтавага прыёму, раздзельных конкурсаў для сельскіх і гарадскіх абітурыентаў, прадстаўлення льгот, існуючых для пераможцаў рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд, дзяцей-інвалідаў і сірот, моладзі з чарнобыльскіх раёнаў. На нарадзе ўзнімаліся і іншыя сур'ёзныя пытанні, якія закранalі далейшую жыццядзейнасць устаноў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

* * *

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка падпісаў Указ аб стварэнні дзяржаўнай камісіі па кантролю ўступных экзаменаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах.

Галоўная задача камісіі — забяспечыць маладым грамадзянам роўныя магчымасці пры паступленні ў навучальныя ўстановы. У склад камісіі ўвайшлі кіраўнікі рэспубліканскіх і мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання. Узначаліць яе даручана старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю А.Тозіку.

Зацверджана Палажэнне аб дзяржаўнай камісіі, якое замацоўвае яе функцыі і паўнамоцтвы. У адпаведнасці з Указам уступныя экзамены ў дзяржаўных вышэйшых навучальных установах пачнуцца ў ліпені з профільнага (конкурснага) экзамену. Пісьмовы экзамен па беларускай (рускай) мове і літаратуры будзе праводзіцца ў вызначаныя Міністэрствам адукацыі дні з аб'яўленнем заданняў па радыё і тэлебачанню.

Дзяржаўнай камісіі прадпісана па выяўленых фактах парушэнняў правіл прыёму ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы аператыўна прымаць прадугледжаныя заканадаўствам меры.

Указам прадугледжана шырокае асвятленне вынікаў работы камісіі ў сродках масавай інфармацыі.

## ДЛЯ ЗАХАВАННЯ ДУХОЎНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ

Праўленне Таварыства Кірыла Тураўскага і савет Славянскай спецыялізаванай бібліятэкі правялі серыю мерапрыемстваў, прысвечаных чарговай гадавіне з дня нараджэння Кірыла Тураўскага — аднаго са стваральнікаў і распаўсюджвальнікаў духоўных славянскіх каштоўнасцей.

У аўторак і сераду на мінулым тыдні ў грамадска-культурным цэнтры праходзіла Міжнародная навуковая канферэнцыя "Славянскі свет на парозе трэцяга тысячагоддзя". У ёй прынялі ўдзел не толькі беларускія навукоўцы, у тым ліку і нашага універсітэта, але і госці з Расіі, Украіны, Польшчы, прыбалтыйскіх дзяржаў. У ходзе канферэнцыі абмеркаваны перспектывы стварэння Славянскай энцыклапедыі, аб чым вялася размова на прайшоўшым у Маскве Міжнародным славянскім з'ездзе.



**НА ЗДЫМКУ: М.В.Селькін і В.Л.Калашнікаў у час сустрэчы ў Славянскай бібліятэцы.**

*Фота Н.Бяльковіча.*

Аб інтэграцыі намаганняў беларускіх і расійскіх вучоных у гэтым накірунку вялі размову на чарговай рабочай нарадзе праўлення Таварыства Кірыла Тураўскага і савета Славянскай бібліятэкі член Пастаяннай камісіі па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу нашай краіны рэктар ГДУ прафесар, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь М.В.Селькін і рэктар Маскоўскага інстытута нацыянальных і рэгіянальных адносін прафесар, акадэмік Міжнароднай Славянскай акадэміі У.Л.Калашнікаў. Высокі расійскі госць перадаў у дар Славянскай бібліятэцы нашага горада некалькі экзэмпляраў новага выдання асабістай манаграфіі "Славянская цывілізацыя" і першы нумар часопіса "Образование в регионах России и СНГ" за сёлетні год.

## З фальклорных крыніц

## ЧУЮ, БУДЗЕ СЁННЯ СВЯТА!

Кожны год вясною (і гэта сімволіка!) першакурснікі-філолагі рускага аддзялення рыхтуюць тэатралізаваныя прадстаўленні — гэта і традыцыйныя народныя вяселлі, і тэатр Пятрушкі, і розныя абрадавыя відовішчы. Арганізоўваюцца ўсе гэтыя цікавыя пастаноўкі і дапамагае маладым людзям раскрыць свае таленты і творча рэалізавацца загадчыца кафедры рускай літаратуры дацэнт Л.Л.Ермакова. Вось і нядаўна, у аўдыторыі 1-14 сабраліся гледачы — студэнты і настаўнікі, каб падзівіцца на чарговае фальклорнае свята "Гуканне вясны", якое падрыхтавалі студэнты групы Р-11. Узбуджаныя, у радасным настроі, з усмешкамі на вуснах глядзелі "акцёры" і гледачы адзін на аднаго і весела пляскалі ў далоні. Было шмат добрых водзываў і ад студэнтаў, і ад запрошаных на свята выкладчыкаў беларускага аддзялення. Высока ацаніла фальклорнае прадстаўленне дацэнт кафедры беларускай літаратуры В.С.Новак, падзякаваў студэнтам за прыемныя хвіліны намеснік дэкана па выхаваўчай рабоце С.І.Ханеня. А дацэнт кафедры беларускай літаратуры В.К.Шынкарэнка падвяла лагічны і прыгожы вынік усяму ўбачанаму: "Вясна — не стан прыроды, а стан душы. Здавалася, сама вясна сваёй прыгажосцю і мелодыяй кахання натхніла студэнтаў-першакурснікаў на творчую працу".

**Таццяна ЦЕЛЯХОВІЧ,**
**студэнтка гр. РБ-33**
**філалагічнага факультэта.**

## І ПАШАНА, І МАТЭРЫЯЛЬНАЯ ПАДТРЫМКА

З кожным годам радзеюць рады ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. І заканамерна, што да іх мы адносімся ўсё з большай павагай. Гэта стала відавочным і ў час правядзення ўрачыстасцей у гонар 56-й гадавіны Вялікай Перамогі.

У цёплы майскі дзень ветэраны Вялікай Айчыннай вайны універсітэцкага калектыву былі запрошаны ў ГДУ, каб зноў ушанаваць светлую памяць загінуўшых за вызваленне нашай Радзімы, сумесна адзначыць самае вялікае свята.

На мітынгу, які адбыўся ля брацкай магілы у студэнцкім парку, з кароткай прамовай выступіў старшыня савета ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, Узброеных Сіл і працы палкоўнік у адстаўцы А.А.Косцікаў. Удзельнікі мітынгу мінутай маўчання аддалі даніну павагі тым, хто аддаў свае жыцці ў імя Вялікай Перамогі.

Для ветэранаў быў наладжаны святочны "Агеньчык", ім аказана матэрыяльная дапамога. У адрас абаронцаў Айчыны было выказана шмат цёплых віншавальных слоў.

*Звыш 90 студэнтаў нашага універсітэта сёлета пажадалі паралельна з асноўнай атрымаць дадатковую спецыяльнасць па правазнаўству, падрыхтоўка па якой пачалася з бягучага навучальнага семестра.*





**НА ЗДЫМКУ: з лекцыяй перад студэнтамі, якія набываюць дадатковую спецыяльнасць у Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі спецыялістаў пры ГДУ выступае дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права І.В.Нямкевіч.**

*Фота У.Чысціка.*

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджана дацэнт кафедры беларускай мовы ЛЯШЧЫНСКАЯ Вольга Аляксееўна.*

Абітурыентам-2001

# ЯК ЛЕПШ ПАДРЫХТАВАЦЦА

***СЁЛЕТА ЧАКАЕЦЦА САМАЯ ВЯЛІКАЯ КОЛЬКАСЦЬ ПАСТУПАЮЧЫХ У ВЫШЭЙШЫЯ НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ НАШАЙ КРАІНЫ. УЛІЧВАЮЧЫ ГЭТУЮ АКАЛІЧНАСЦЬ, А ТАКСАМА ТОЕ, ШТО Ў ПРАВІЛЫ ЎСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАЎ УНЕСЕНЫ ІСТОТНЫЯ ЗМЯНЕННІ, ПРЫЁМНАЯ КАМІСІЯ УНІВЕРСІТЭТА ПРАПАНУЕ АБІТУРЫЕНТАМ ГДУ РЭКАМЕНДАЦЫІ СТАРШЫНЬ ПРАДМЕТНЫХ КАМІСІЙ З МЭТАЙ АКАЗАННЯ ДАПАМОГІ ДЛЯ БОЛЬШ ПАСПЯХОВАЙ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ПРАДСТАЯЧЫХ ЭКЗАМЕНАЦЫЙНЫХ ВЫПРАБАВАННЯЎ.***

## МАТЭМАТЫКА



Пісьмовы экзамен праводзіцца ў выглядзе кантрольнай работы. Абітурыентам прапануецца два варыянты экзаменацыйнага задання (варыянт кожнаму канкрэтна ўказваецца членам прыёмнай камісіі). Як правіла, варыянты змяшчаюць заданні, якія ахопліваюць усе раздзелы школьнай матэматыкі, а таксама адзін ці два вусныя пытанні (па алгебры і геаметрыі).

Рашэнні задач запісваюцца спачатку ў чарнавік, а потым пераносяцца ў чыставік. Задача ці прыклад лічацца рэшанымі, калі ў чыставіку прыведзена іх поўнае рашэнне з адказам. Калі на афармленне ў чыставіку не хапае часу, то трэба ўказаць, што рашэнне знаходзіцца ў чарнавіку. У гэтым выпадку правяраецца рашэнне ў чарнавіку.

На экзамен не дазваляецца прыносіць калькулятары, кнігі, даведнікі, табліцы, а таксама чыстыя лісты паперы. Пісаць і рабіць чарцяжы трэба толькі шарыкавай ручкай з сінімі чарніламі.

Для выканання ўсяго задання абітурыенту даецца чатыры астранамічныя гадзіны.

Па пісьмовай рабоце выстаўляецца адна з наступных шасці адзнак: "5", "4,5", "4", "3,5", "3", "2".

Напрыклад, **адзнака "5" (пяць)** ставіцца за пісьмовую работу, у якой выкананы ўсе шэсць заданняў без памылак, а **адзнака "2" (два)** ставіцца за пісьмовую работу, у якой выкананы менш за тры заданні.

Аналіз экзаменацыйных работ паказвае, што большасць памылак абітурыенты дапускаюць пры рашэнні стэрэаметрычных задач (няўменне правільна і грунтоўна выканаць чарцёж), пры пераўтварэнні трыганаметрычных і лагарыфмічных выразаў. Шмат памылак выклікана няўменнем даследаваць атрыманыя рашэнні і выбраць правільны адказ.

Пры правядзенні вуснага экзамену па матэматыцы абітурыентам прапануецца выбраць білет, які змяшчае два тэарэтычныя пытанні (па алгебры і геаметрыі) і задачу. Прапануемыя пытанні не выходзяць за межы праграмы па матэматыцы для паступаючых у ВНУ. Гэтыя пытанні можна знайсці ў даведніку для абітурыентаў. На падрыхтоўку да адказу даецца 45 хвілін.

Адказ ацэньваецца **адзнакай "5" (пяць)**, калі абітурыент:

пры адказе на тэарэтычныя пытанні поўнасцю раскрыў змест матэрыялу ў аб'ёме, прадугледжаным праграмай, правільна і абгрунтавана адказаў на ўсе дадатковыя пытанні і поўнасцю зрабіў практычную частку задання, прычым у лагічных разважаннях і абгрунтаванні рашэння, а таксама ў самім рашэнні не дапусціў пралікаў і памылак.

Пры гэтым дапускаецца наяўнасць аднаго праліку ў тэарэтычнай або практычнай частцы адказу, які лёгка выпраўляецца абітурыентам пасля заўвагі экзаменатараў.

**Адзнака "2" (два)** ставіцца ў наступных выпадках:

а) не раскрыты асноўны змест тэарэтычнага матэрыялу, выяўлена няведанне або неразуменне абітурыентам большай або найбольш важнай часткі тэарэтычнага матэрыялу;

б) у практычнай частцы задання дапушчаны грубыя памылкі, якія паказваюць, што абітурыент не валодае абавязковымі ўменнямі па дадзенай тэме ў поўнай меры;

в) дадзены правільны адказ менш чым на два пытанні білета, уключаючы задачу, або калі дадзены правільныя адказы на два пытанні білета, уключаючы задачу, аднак дадзены няправільныя або неабгрунтаваныя адказы больш чым на два дадатковыя пытанні экзаменатара.

Адказ абітурыента на білет вуснага экзамену па матэматыцы ацэньваецца па дзесяцібальнай сістэме (выстаўляецца адна з дзесяці адзнак: "1", "2", "3", "4", "5", "6", "7", "8", "9", "10") для паступаючых на спецыяльнасць АСАІ. Пры гэтым абітурыенты лічацца атрымаўшымі станоўчую адзнаку, калі іх адказ ацэнены трыма і больш баламі.

Аналіз памылак на вусных экзаменах паказвае, што часцей за ўсё абітурыенты блытаюць азначэнні і паняцці матэматычных тэрмінаў, не праяўляюць дакладнасці пры азначэнні і аналізе ўласцівасцей функцый і пабудове іх графікаў, няправільна рашаюць ірацыянальныя няроўнасці і ўраўненні, якія змяшчаюць знак модуля.

## ЗАМЕЖНЫЯ МОВЫ



Уступныя экзамены па замежных мовах сёлета значна пашыраны.

На ўсе спецыяльнасці эканамічнага факультэта яны будуць праводзіцца ў пісьмовай форме і змяшчаць наступныя заданні:

— пераклад тэксту (без слоўніка);

— пастаноўку пытанняў да тэксту;

— граматычны тэст (20 пазіцый);

— заданне на трансфармацыю;

— сітуацыю па вуснай тэме.

Абітурыенты, якія жадаюць паступаць на факультэт замежных моў, будуць здаваць пісьмовы і вусны экзамены па замежнай мове.

Пісьмовы экзамен будзе мець форму тэста (60 пазіцый на 1,5 гадзіны). У заданні будуць уключаны:

— розныя структурныя мадэлі сказа і камунікатыўныя тыпы выказванняў;

— дзеяслоўна-часавыя формы ў незалежным стане;

— розныя класы займеннікаў асабовых, прыналежных, неазначальных;

— формы адзіночнага і множнага ліку і прыналежнага склону назоўнікаў;

— ступені параўнання прыметнікаў і прыслоўяў;

— прыназоўнікі месца і часу, найбольш частотныя выпадкі прыназоўнага кіравання;

— азначальны і неазначальны артыклі.

Правяраецца таксама веданне тыповых маўленчых формул і ўменне выкарыстоўваць іх у камунікатыўна адэкватных умовах, а таксама валоданне школьным лексічным мінімумам.

Большасць заданняў тэста складзены па тыпу альтэрнатыўнага або множнага выбару, прадугледжаны таксама заданні на трансфармацыю, словаўтварэнне, на выкарыстанне патрэбнай часовай формы.

У граматычным тэсце кожнае выпраўленне лічыцца недакладнасцю і прыроўніваецца да 0,25 памылкі.

Дзеяслоўна-часавыя формы ацэньваюцца па наступных катэгорыях: стан, трыванне, час, форма. Скажэнне любой з указаных катэгорый ацэньваецца як 0,5 памылкі.

Пры трансфармацыі:

— парушэнне парадку галоўных членаў сказа ацэньваецца як 1 (адна) поўная памылка;

— парушэнне парадку даданых членаў сказа ацэньваецца як 0,5 памылкі.

Выдзяленне няправільнага варыянта з прапанаваных на выбар ацэньваецца як 1 (адна) поўная памылка.

Адсутнасць адказу ацэньваецца як 1,5 (паўтары) памылкі.

У вусны экзамен уключаецца:

— аўдзіраванне (праверка разумення з дапамогай тэсту);

— тэкст (пераклад, чытанне, пераказ, пастаноўка пытанняў);

— сітуацыя па вуснай тэме.

У вусны экзамен для спецыяльнасцей "Беларуская мова і літаратура са спецыялізацыяй "Англійскай мова" і "Гісторыя з дадатковай спецыяльнасцю "Англійская мова" ўключаны:

— аўдзіраванне (праверка разумення праз пытанні);

— тэкст (чытанне, пераклад, пераказ, адказы на пытанні);

— картка з пісьмовым заданнем;

— гутарка па вуснай тэме.

Для спецыяльнасцей "Правазнаўства" і "Гісторыя" вусны экзамен па замежнай мове ўключае:

— тэкст (чытанне, пераклад, пераказ, адказы на пытанні);

— картку з пісьмовым заданнем;

— размову па вуснай тэме.

На вусным экзамене ацэньваюцца наступныя віды заданняў:

1. чытанне ўслых: адпаведнасць правілам чытання літар і літараспалучэнняў, правільнае дзяленне сказаў на сэнсавыя групы і іх інтанацыйнае афармленне;

2. пісьмовы пераклад урыўка тэксту: літаратурна-сэнсавая адэкватнасць і граматычная правільнасць;

3. пытанні па тэксту: граматычная правільнасць; выкарыстанне ўсіх тыпаў пытанняў; раскрыццё ў пытаннях зместу тэксту;

4. адказы на пытанні экзаменатара па тэксту; разуменне мовы экзаменатара на слых; сэнсавая і граматычная правільнасць адказу;

5. пераказ тэксту: лагічны пераказ зместу тэксту; лексічная і граматычная разнастайнасць і правільнасць мовы;

6. граматычнае тэсціраванне: граматычная правільнасць выканання прапанаваных заданняў, складзеных на аснове праграмнага матэрыялу сярэдняй школы;

7. маналагічнае выказванне абітурыента па тэме; размова па тэме; лексічная, граматычная і фанетычная правільнасць мовы, тэмп мовы; лексічная і граматычная разнастайнасць выказванняў; лагічнасць, спантаннасць і аргументаванасць адказу.

## ГЕАГРАФІЯ



Уступныя экзамены па геаграфіі будуць здаваць абітурыенты, паступаючыя на спецыяльнасці: "Геаграфія", "Экалогія", "Геалогія і разведка карысных выкапняў". Вопыт працы прыёмнай камісіі ў мінулыя гады дазваляе зрабіць пэўныя высновы аб узроўні падрыхтоўкі абітурыентаў па гэтым прадмеце. Многім здаецца, што геаграфія — не матэматыка, фізіка альбо хімія, і таму ў яе вывучэнні няма складанасцей і яны яе добра ведаюць. Аднак на самой справе гэта далёка не так. Напрыклад, на ўступных экзаменах у мінулым годзе многія абітурыенты не толькі не пацвердзілі адзнак у атэстатах, але і "праваліліся". Пры гэтым аналіз вынікаў уступных экзаменаў паказвае, што з кожным годам узровень падрыхтоўкі абітурыентаў зніжаецца, асабліва ў выпускнікоў сельскіх школ.

Якія ж пытанні выклікаюць найбольшую цяжкасць пры адказах на ўступных экзаменах? У якіх раздзелах школьнага курса геаграфіі горш за ўсё арыентуюцца выпускнікі сярэдняй школы? Па-першае, многія дрэнна ведаюць асноўныя паняцці і фармуліроўкі, не умеюць даваць звязаную, паслядоўную характарыстыку элементаў прыроднага асяроддзя, не могуць паказаць асноўныя ўзаемасувязі паміж імі. Па-другое, не могуць даць дастаткова матываваную гаспадарчую ацэнку прыродным умовам і паказаць сувязі, існуючыя паміж прыроднай сферай і гаспадарчай дзейнасцю грамадства. Па-трэцяе, вельмі дрэнна абітурыенты ведаюць асноўныя прынцыпы размяшчэння вытворчасці і фактары, якія вызначаюць развіццё асобных галін на той ці іншай тэрыторыі. Па-чацвёртае, з прыватных пытанняў найбольшую цяжкасць выклікаюць пытанні агульнай цыркуляцыі атмасферы, паняцці аб геаграфічнай абалонцы і прыродных тэрытарыяльных комплексах, агульныя геаграфічныя заканамернасці Зямлі, геалагічная гісторыя нашай планеты, сувязь рэльефу з геалагічнай будовай і тэктонікай тэрыторыі, параўнальная характарыстыка асобных рэгіёнаў і краін, пытанні эканоміка-геаграфічнага раянавання, геаграфіі важнейшых міжгаліновых комплексаў і асобных галін вытворчасці. Вялікую трывогу выклікае тое, што пераважная большасць выпускнікоў школ вельмі дрэнна ведае геаграфічную наменклатуру і зусім не ўмее арыентавацца на розных картах. Складваецца ўражанне, што яны ўвогуле першы раз у жыцці бачаць геаграфічныя карты і нават баяцца да іх падысці (пры падрыхтоўцы адказу на вусных уступных іспытах дазваляецца карыстацца картамі). А які ж географ можа быць без ведання карты? І, нарэшце, самае прыкрае — вельмі дрэнныя веды ў абітурыентаў па геаграфіі сваёй мясцовасці і раёна, вобласці і ў цэлым Рэспублікі Беларусь.

Галоўная асаблівасць уступнага экзамену па геаграфіі ў бягучым годзе заключаецца ў тым, што абітурыенты, паступаючыя на спецыяльнасці "Геаграфія" і "Экалогія", будуць здаваць яго пісьмова. У адпаведнасці з праграмай па геаграфіі для паступаючых у вышэйшыя навучальныя ўстановы Рэспублікі Беларусь змест пісьмовага экзамену ўключае тры пытанні. Першае — па фізічнай геаграфіі, другое — па эканамічнай геаграфіі, трэцяе пытанне сфармулявана ў выглядзе тэста, яго галоўная задача — праверыць веды геаграфічнай наменклатуры. Што датычыць вуснага экзамену, яго будуць здаваць абітурыенты, паступаючыя на спецыяльнасць "Геалогія і разведка карысных выкапняў". У білеце будзе два пытанні: першае — па фізічнай геаграфіі, другое — па эканамічнай геаграфіі. Пры гэтым адно з іх у абавязковым парадку па геаграфіі Рэспублікі Беларусь.

## ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ І СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ



Вынікі ўступных экзаменаў па гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі патрабуюць звярнуць увагу абітурыентаў на тыя пытанні, якія выклікаюць у іх найбольшыя цяжкасці. Перш за ўсё яны звязаны з гісторыяй рэлігіі і культуры.

Варта больш канкрэтна даваць характарыстыку эканамічным і сацыяльным пераўтварэнням у рэспубліцы і яе ўдзелу ў міжнароднай дзейнасці пасля другой сусветнай вайны.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на праблемы нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі ў 1917-1990-ыя гады.

Пры здачы экзамену па сусветнай гісторыі найбольшыя цяжкасці выклікаюць пытанні, звязаныя з пасляваенным (1918-1923 г.г.) крызісам заходняга грамадства, са стварэннем антыгітлераўскай кааліцыі ў гады другой сусветнай вайны, з развіццём вядучых краін Усходу (Японіі, Кітая, Індыі) на сучасным этапе.

Пры адказах на пытанні білетаў неабходна акцэнтаваць увагу на веданні персаналій і храналогіі гістарычных падзей.

# ДА ЎСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАЎ У ГДУ

Абітурыентам-2001

## ФІЗІКА



Мэта экзамену па гэтай дысцыпліне — ацаніць якасць ведаў абітурыента і ўменне прымяняць іх для рашэння канкрэтных задач. Экзаменацыйныя білеты складаюцца ў поўнай адпаведнасці з праграмай для паступаючых у ВНУ Рэспублікі Беларусь і ўключаюць два тэарэтычныя пытанні і задачу. Пытанні камплектуюцца такім чынам, каб сумесна з задачай больш поўна ахапіць розныя раздзелы курса фізікі.

Умоўны пералік гэтых раздзелаў наступны:

**Кінематыка. Асновы дынамікі. Законы захавання ў механіцы.**

**Элементы статыкі. Вадкасці і газы.**

**Асновы малекулярна-кінетычнай тэорыі газаў. Газавыя законы.**

**Цеплавыя з'явы.**

**Электрастатыка.**

**Законы пастаяннага току.**

**Магнітнае поле. Электрамагнітная індукцыя.**

**Хістанні і хвалі.**

**Оптыка. Элементы тэорыі адноснасці.**

**Квантавая фізіка.**

Адказы на тэарэтычныя пытанні білета даюцца ў пісьмовым выглядзе на лістах-укладышах з максімальна большай паўнатой на рускай або беларускай мовах. У адказах павінны ўтрымлівацца вызначэнні фізічных велічыняў і фармуліроўкі фізічных законаў, формулы і пры неабходнасці — іх вывады, графікі, якія ілюструюць сутнасць разглядаемых фізічных з'яў, схемы эксперыментаў.

Абітурыент рашае задачу на чарнавіку, затым перапісвае яе на чысты ліст з захаваннем правілаў афармлення рашэння задачы, згодна з якімі прадугледжваецца кароткая ўмова, поўнае рашэнне, аналітычны і лікавы адказ. Усе велічыні павінны быць выражаны ў адзінках СІ, пажадана правесці праверку размернасцяў у канчатковым выразе. Карыстацца даведнікамі, калькулятарамі, табліцамі, а таксама прыносіць з сабой чыстыя лісты для чарнавіка не дапускаецца. Усе неабходныя для рашэння задачы лічбавыя значэнні змешчаны ў яе ўмове.

Усе запісы ажыццяўляюцца шарыкавай або пер'евай ручкай. Колер чарнілаў і пасты — сіні, чорны або фіялетавы. Не дазваляецца карыстацца алоўкам, гелевай ручкай і пастамі светлых таноў — зялёнай і чырвонай.

Абітурыент інфармуецца аб крытэрыях выстаўленай адзнакі. У выпадку нязгоды ён мае права ў дзень аб'яўлення адзнакі падаць апеляцыю ў прыёмную камісію, якая будзе разгледжана ў яго прысутнасці. Рашэнне апеляцыйнай камісіі з'яўляецца канчатковым.

Пры няяўцы на экзамен па ўважлівай прычыне абітурыент павінен прадставіць даведку ў прыёмную камісію, пасля чаго пытанне аб яго допуску да здачы экзамену ў іншы дзень вырашаецца прыёмнай камісіяй.

Аналіз вынікаў уступных экзаменаў мінулых гадоў патрабуе ўказаць на найбольш слабыя месцы ў падрыхтоўцы абітурыентаў.

Пры адказе перш за ўсё неабходна акцэнтаваць увагу на сутнасці разглядаемай з'явы, выдзеліць сярод удзельнічаючых у ёй апісанні фізічных велічыняў прычыну і вынік і ўстанавіць сувязь паміж імі, затым запісаць адпаведную формулу. Трэба мець на ўвазе, што ў адрозненне ад матэматычных выразаў, фізічная формула аперыруе канкрэтнымі паняццямі, а таму мае значэнне парадак яе запісу. Асаблівую ўвагу варта ўдзяліць аналізу каэфіцыентаў прапарцыянальнасці — фундаментальных канстант і ўясненняў іх фізічнага сэнсу.

Пры рашэнні задач у працэсе пераўтварэння формул трэба сачыць за тым, каб размернасці захоўваліся і ў прамежкавых аперацыях. Кожны прамежкавы выраз павінен мець свой сэнс, які адлюстроўвае сувязь паміж вызначаемымі фізічнымі велічынямі.

Пры рашэнні задач і фармуляванні законаў асаблівая ўвага павінна быць удзелена апісанню ўмоў прымянімасці тых або іншых формул і абгрунтаванню магчымасцей іх прымянення, што звязана з набліжанасцю ўсіх фізічных законаў.

Правядзенне вылічэнняў павінна ажыццяўляцца з выкарыстаннем правіл дзеянняў з набліжанымі лічбамі. Адказ трэба акругляць у адпаведнасці з правіламі акруглення. Дакладнасць атрыманага выніку павінна адпавядаць дакладнасці пачатковых умоў.

## ХІМІЯ



Экзамен абітурыенты здаюць вусна. Экзаменацыйныя білеты па прадмету складзены згодна з праграмай для паступаючых у ВНУ Рэспублікі Беларусь. Білет змяшчае два тэарэтычныя пытанні, у якіх раскрываюцца агульныя заканамернасці неарганічнай і арганічнай хіміі. Пытанні па неарганічнай хіміі ахопліваюць такія значныя тэмы як "Электронная будова атама і перыядычная сістэма Д.І.Мендзялеева", "Хімічная сувязь і будова малекул", "Хімічная кінетыка, цеплавыя эфекты хімічных рэакцый", "Уласцівасці раствораў. Спосабы выражэння канцэнтрацыі раствораў", "Тэорыя электралітычнай дысацыяцыі", "Рэакцыі абмену ў растворах электралітаў", "Хімія элементаў", "Генетычная сувязь паміж класамі неарганічных злучэнняў".

Тэмы па арганічнай хіміі пабудаваны ў білетах такім чынам, што прасочваюцца агульныя тэндэнцыі хімічнай будовы рэчыва і хімічных уласцівасцей вуглевадародаў (алканы, цыклаалканы, алкены, алкадыены, алкіны, арэны), кіслазмяшчаючых злучэнняў (спірты, фенолы, альдэгіды, карбонавыя кіслоты, простыя і складаныя эфіры, вугляводы і інш.), азотзмяшчаючых злучэнняў (аміны, амінакіслоты і г.д.). Увесь змест пытанняў па арганічнай хіміі накіраваны на выяўленне генетычных сувязей паміж групамі арганічных злучэнняў. У аснову пакладзены пытанні: "Тэорыя пабудовы арганічных злучэнняў А.М.Бутлерава", "Ізамерыя арганічных злучэнняў", "Узаемны ўплыў атамаў у малекулах арганічных злучэнняў".

Трэцяе пытанне білета ўяўляе ланцужкі пераўтварэння неарганічных і арганічных рэчываў, у якіх абітурыент павінен паказаць веды па хіміі асобных элементаў, злучэнняў, умоў пераўтварэння адных рэчываў у іншыя, уменні правільна запісаць ураўненні рэакцый, а для акісляльна-аднаўленчых скласці электронны баланс, даць назву злучэнням, а калі ва ўмове дадзены назвы, напісаць іх хімічныя формулы.

Чацвёртае пытанне ўяўляе разліковую задачу па тэмах, якія вызначаны праграмай для паступаючых у ВНУ. Разліковыя задачы складзены такім чынам, каб абітурыенты змаглі пераканаць экзаменатараў ва ўменні прымяняць свае тэарэтычныя веды на практычных прыкладах.

Пры ацэнцы ведаў абітурыентаў прымяняецца шасцібальная сістэма, у якой палова балаў аддаецца тэарэтычным пытанням, другая — практычным практыкаванням і задачы.

## БЕЛАРУСКАЯ (РУСКАЯ) МОВА І ЛІТАРАТУРА



**1. Па беларускай (рускай) мове і літаратуры (сачыненне).**

У кожным варыянце экзаменацыйнага задання па беларускай (рускай) мове і літаратуры (сачыненне) абітурыентам прапануецца па 2 тэмы літаратурнага характару па беларускай мове і літаратуры і па рускай мове і літаратуры і 1 тэма маральна-этычная (агульная для двух відаў пісьмовага задання). Тэмы сачыненняў даюцца па творчасці пісьменнікаў, уключаных у зацверджаныя для ўступных экзаменаў праграмы. Абітурыентам выконваецца адна з прапанаваных тэм (на выбар). Рэкамендуецца апрацоўка зместу тэксту на чарнавіку ўстаноўленага ўзору.

Час правядзення экзамену — 4 астранамічныя гадзіны.

Выкарыстоўваць на экзаменах даведачную літаратуру не дазваляецца.

**2. Па беларускай (рускай) мове і літаратуры (ізлажэнне).**

Абітурыентам прапануецца звязны або адаптаваны тэкст ізлажэння аб'ёмам 400-500 слоў (як правіла, з праграмных літаратурна-мастацкіх твораў пісьменнікаў).

Перад выкананнем пісьмовай работы тэкст ізлажэння зачытваецца 2 разы, пасля чаго абітурыентам прапануецца зрабіць пісьмовы пераказ тэксту, блізкі да яго зместу. Рэкамендуецца апрацоўка зместу тэксту на чарнавіку ўстаноўленага ўзору.

Час правядзення пісьмовага экзамену — 4 астранамічныя гадзіны.

**3. Па беларускай (рускай) мове і літаратуры (дыктант).**

Абітурыентам прапануецца звязны або адаптаваны тэкст дыктанта аб'ёмам 220-240 слоў (як правіла, з праграмных літаратурна-мастацкіх твораў пісьменнікаў).

Перад выкананнем пісьмовай работы тэкст дыктанта зачытваецца экзаменатарам 1 раз. Рэдка ўжывальныя і незразумелыя для абітурыентаў словы запісваюцца на дошцы. Пасля зачытваецца кожны асобны сказ і ў працэсе работы абітурыентаў асобныя яго часткі і зноў — увесь сказ. Пісьмовая работа выконваецца адразу на чыстым экзаменацыйным лісце.

Пасля напісання дыктанта абітурыентам даецца час на праверку правільнасці яго афармлення.

Выкарыстанне на экзаменах даведачных матэрыялаў не дазваляецца.

**4. Па беларускай (рускай) мове і літаратуры (вусны экзамен).**

Экзамен праводзіцца па экзаменацыйных білетах. У экзаменацыйных білетах указваюцца 2 тэарэтычныя пытанні (адно — па мове, другое — па літаратуры) і 1 практычнае заданне па мове. Тэарэтычны і практычны матэрыял экзаменацыйнага білета фармулюецца ў межах праграмных патрабаванняў, зацверджаных для ўступных экзаменаў. Тэарэтычнае пытанне па літаратуры ахоплівае асноўныя этапы развіцця літаратуры, пачынаючы з XI ст. і патрабуе ведання біяграфій пісьменнікаў, жанравай адметнасці, ідэйнага зместу, сюжэта, кампазіцыі і мастацкіх асаблівасцей праграмных твораў. У білетах па рускай літаратуры ўключаны, акрамя таго, пытанні па замежнай літаратуры.

Практычнае заданне па мове ўключае поўны сінтаксічны разбор сказа, а таксама фанетычны, словаўтваральны, марфалагічны і марфемны (па саставу) разбор выдзеленых слоў.

Пры падрыхтоўцы да вуснага экзамену абітурыентам неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на засваенне ідэйнага зместу і мастацкіх асаблівасцей праграмных літаратурных твораў, разуменне мастацкага, гістарычнага і грамадскага значэння літаратурнага твора ў кантэксце свайго часу.

Даволі часта абітурыенты ідэйна-мастацкі аналіз твора замяняюць пераказам яго зместу, не ўмеюць правільна вызначыць асноўную тэматыку і праблематыку твора, акрэсліць яго ідэйны змест, прааналізаваць мастацкія вобразы, іх ролю ў раскрыцці асноўнай думкі аўтара, ахарактарызаваць асаблівасці жанру і кампазіцыі, указаць выяўленча-выразныя моўныя сродкі, адметнасці аўтарскага стылю.

Важным патрабаваннем да адказу абітурыента з'яўляецца культура яго маўлення, уменне правільна, поўна і дакладна, лагічна і паслядоўна выказаць сваю думку, здольнасць аргументаваць свае разважанні і падмацоўваць іх канкрэтнымі прыкладамі. Адказ павінен быць афармлены правільнай літаратурнай мовай, адначасова трэба паказаць багацце слоўнікавага запасу абітурыента.

## БІЯЛОГІЯ



Уступныя экзамены па гэтай дысцыпліне ў веснай форме будуць здаваць абітурыенты, якія паступаюць на біялагічны факультэт і факультэт фізічнай культуры стацыянарнай і завочнай формы навучання.

Пры адказах на пытанні білетаў абітурыенты павінны паказаць глыбокія і ўсебаковыя веды ў аб'ёме праграмы сярэдняй школы. Сур'ёзную ўвагу неабходна звярнуць на асаблівасці мясцовай флоры, фауны і экалогіі.

Экзамен па біялогіі ўключае раздзелы батанікі, заалогіі, анатоміі і фізіялогіі чалавека, генетыкі, прыродакарыстання, структуры і функцыянавання біясферы, эвалюцыі, экалогіі, а таксама агульнай біялогіі.

Білеты складаюцца з трох тэарэтычных пытанняў з розных раздзелаў біялогіі. Як сведчаць вынікі экзаменаў папярэдніх гадоў, абітурыенты даюць найбольш грунтоўныя адказы на пытанні батанікі, анатоміі, заалогіі, гігіены чалавека ў тых выпадках, якія тычацца апісальнага характару разглядаемага матэрыялу. І наадварот: яны слаба адказваюць на пытанні па агульнай біялогіі, генетыцы, эвалюцыйнага вучэння, недастаткова дакладна арыентуюцца па асновах экалогіі. Часта адказы носяць павярхоўны характар і не раскрываюць сутнасці пытанняў.

Многім абітурыентам не ўдаецца ўвязаць тэарэтычныя веды з практыкай сельскай, лясной і прамысловай вытворчасці. Яны не ў стане дакладна сфармуляваць тыя або іншыя паняцці і азначэнні.

Пэўныя цяжкасці выяўляюцца пры напісанні некаторых ураўненняў, названні дат жыцця і дзейнасці вядомых вучоных.

Асобным абітурыентам не ўдаецца паслядоўна выкласці свае веды, звязаць іх у эвалюцыйным аспекце, хаця разам з тым яны валодаюць фактычным матэрыялам, засвоеным у аб'ёме школьнай праграмы.

Абітурыентам-2001

# ЯК ЛЕПШ ПАДРЫХТАВАЦЦА ДА ЎСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАЎ У ГДУ

## ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА

Для паспяховай здачы экзамену па гэтай дысцыпліне неабходна ведаць праграмны матэрыял за курс сярэдняй школы і пераканаўча ў ім арыентавацца. Патрабуецца мець неабходны мінімум ведаў аб развіцці грамадазнаўчых навук (асабліва аб развіцці поглядаў на прыроду чалавека і на яго адносіны да грамадства, чалавека і акаляючага свету). Пры гэтым магчыма прымяненне ведаў па гісторыі, а ў нейкай ступені і па біялогіі.

Абітурыенты абавязаны ведаць асноўныя аспекты грамадазнаўства ў іх узаемасувязі, свабодна валодаць і аперыраваць тэрміналогіяй, умець раскрыць сутнасць ключавых паняццяў (чалавек, прырода, грамадства, асоба, мараль, права, цывілізацыя, культура, нацыя, палітыка, дзяржава, эканоміка і т.п.). Трэба свабодна валодаць тэрміналогіяй, чотка, канкрэтна, лагічна раскрываць сутнасць паняццяў, з'яў, падзей, працэсаў, аперыруючы фактамі і прыкладамі. Выказваючы той ці іншы пункт гледжання, неабходна таксама падмацоўваць свае думкі аргументамі, фактамі, канкрэтнымі прыкладамі. Разам з тым патрэбна даваць дакладныя і аргументаваныя характарыстыкі і вызначэнні з'яў, падзей, працэсаў, інстытутаў грамадскага жыцця ў іх узаемасувязі і ўзаемадзеянні, вызначаць і абагульняць факты, якія на іх уздзейнічаюць.

Абітурыент павінен валодаць уменнямі прымяняць веды пры вывучэнні іншых школьных прадметаў, арыентавацца ў сучасным грамадскапалітычным жыцці. Неабходна канкрэтна, аргументавана, лагічна і вычарпальна адказваць на пастаўленыя пытанні ў рамках праграмы для паступаючых у ВНУ.

Тым абітурыентам, якія будуць паступаць на спецыяльнасць **"Правазнаўства"**, неабходна асабліва добра арыентавацца ў пытаннях, якія датычацца аспектаў развіцця чалавечага грамадства, яго асобных фактараў, розных цывілізацый, разумець разнастайнасць шляхоў і форм сучаснага цывілізаванага развіцця ў тэхнічных, эканамічных, палітычных, культурных адносінах. Трэба добра ведаць гісторыю грамадска-палітычных і нацыянальна-дзяржаўных інстытутаў, разумець ролю і ведаць гісторыю такога важнага культураўтвараючага фактара як рэлігія і значэнне фактару менталітэта і сацыяльнай псіхалогіі ў жыцці чалавечага грамадства.

Паступаючыя на спецыяльнасць **"Псіхалогія"** павінны глыбока ведаць пытанні, якія тычацца праблем: чалавек і прырода; чалавек і грамадства; чалавек сярод людзей; міжасабістыя адносіны; асоба — мараль — права — свабода; грамадскія, палітычныя, эканамічныя адносіны; рэлігія, менталітэт, культура, цывілізацыя, нацыя.

Важна добра разумець ролю і значэнне асобаснага фактару ў гісторыі. Карысна падмацоўваць вывады гістарычнымі прыкладамі. Пажадана добра арыентавацца ў гісторыі чалавечай думкі, якая знайшла адлюстраванне ў літаратуры, мастацтве, развіцці навукі.

Пісьмовы адказ на кожнае пытанне павінен быць канкрэтным, аргументаваным, уяўляць сабой лагічны, вычарпальны і, пажадана, лаканічны дакумент. Важна звярнуць увагу на культуру афармлення і захаванне арфаграфічнага рэжыму.

СПОРТ



## ЗАСТАЛІСЯ СІЛЫ І МАЙСТЭРСТВА

Чарговы чэмпіянат Беларусі па цяжкай атлетыцы сярод ветэранаў на прыз алімпійскага чэмпіёна Валерыя Шарыя адбыўся на яго радзіме ў г.Чэрвені Мінскай вобласці. Спаборніцтвы праходзілі ў суправаджэнні вялікай канцэртнай праграмы з удзелам народнага артыста СССР кампазітара Ігара Лучанка ў перапоўненай балельшчыкамі зале мясцовага Дома культуры.

У такой урачыстай абстаноўцы ў дзень свайго 65-годдзя дацэнт кафедры філасофіі ГДУ Аляксей Фяськоў не толькі стаў чэмпіёнам, але і ўстанавіў тры рэкорды Рэспублікі Беларусь для свайго ўзросту, з чым 7 мая яго цёпла павіншавалі на пасядженні рэктарата.



**На здымку: Аляксей Фяськоў з ганаровым прызам.**

## ПАРАДАВАЛІ ВАЛЕЙБАЛІСТЫ



У сёлетнім сезоне выдатна выступіла мужчынская каманда нашага універсітэта па валейболу. Яна стала чэмпіёнам Рэспублікі Беларусь і ўладальнікам Кубка краіны. У гэтым вялікая заслуга яе трэнераў В.Макарэвіча і В.Дубіцкага.

## ПЕРАМОЖНЫЯ ЗАПЛЫВЫ



У круглагадовай спартакіядзе студэнтаў сёлета вызначыліся плыўцы нашага універсітэта. Каманда была ўкамплектавана выхаванцамі факультэта фізічнай культуры, якія ў агульным заліку набралі найбольшую колькасць ачкоў і фінішавалі ў турнірнай табліцы з вялікім адрывам ад Віцебскага дзяржуніверсітэта імя П.М.Машэрава і Акадэміі фізічнага выхавання і спорту.

Найбольш важкі ўклад у агульную капілку ўнёс першакурснік Мікалай Ганчароў. Ён быў мацнейшым на дыстанцыях 50 і 100 м брасам, а таксама дапамог сваім таварышам заваяваць вышэйшыя ўзнагароды ў дзвюх эстафетах. Яго аднакурснік Станіслаў Невяроўскі таксама ўзняўся на вышэйшую прыступку п'едэсталу гонару пасля эстафетных заплываў і заваяваў сярэбраную і бронзавую ўзнагароды на асобных дыстанцыях.

З пяццю ўзнагародамі вярнуўся ва універсітэт са спаборніцтваў чацвёртакурснік Уладзімір Катлоўскі. Ён сярод тых, хто паказаў лепшы вынік у дзвюх эстафетах і ўладальнік трох сярэбраных медалёў.

Не засталіся без узнагарод і нашы плыўчыхі. Найбольш паспяхова выступілі Віка Гаўрыленка і Яніна Грамовіч.

У дасягненнях плыўцоў — вялікая заслуга і іх трэнераў: ст. выкладчыка кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту Б.Гіля, выкладчыка гэтай жа кафедры І.Карніенкі і выкладчыка кафедры фізічнага выхавання і спорту С.Кузаўкова.

## ЗНОЎ ПЕРШЫЯ!



У Мінску адбыліся фінальныя спаборніцтвы па пауэрліфтынгу ў праграме Рэспубліканскіх студэнцкіх гульняў, дзе за ўзнагароды барацьбу вялі 17 ВНУ рэспублікі.

Зноў, як і ў мінулыя гады, у агульнакамандным заліку перамаглі студэнты нашага універсітэта (трэнер — майстар спорту У.Галавач).

На вышэйшую прыступку п'едэсталу гонару ў асабістых спаборніцтвах падняліся: майстар спорту Павел Чэкмароў (56 кг) — 3 курс; майстар спорту міжнароднага класа Уладзімір Гадуноў (75 кг) — 5 курс, устанавіўшы рэкорд Беларусі ў жыме лежачы — 192,5 кг; майстар спорту Пётр Клімкоў (125 кг) — 3 курс, устанавіўшы рэкорд Беларусі ў суме трохбор'я — 812,5 кг. Усе — з факультэта фізічнай культуры.

Сярэбраныя ўзнагароды першынства прывезлі ў Гомель: другакурснік эканамічнага факультэта Максім Пятроўскі (52 кг), чацвёртакурснік гістарычнага факультэта Андрэй Кашыцкі (110 кг), а таксама студэнт факультэта фізічнай культуры Міхаіл Антропаў (56 кг) — 4 курс і майстар спорту Уладзімір Арцёменка (67,5 кг) — 2 курс.

## У КРОКУ АД П'ЕДЭСТАЛУ ГОНАРУ



У Гродна прайшлі спаборніцтвы па лёгкаатлетычнаму кросу ў праграме Рэспубліканскіх студэнцкіх гульняў.

У агульнакамандным заліку ганаровая тройка каманд такая: Брэсцкі і Гродзенскі універсітэты і Акадэмія фізічнай культуры і спорту. Нашы красмены размясціліся на чацвёртай прыступцы.

У бегу на 8000 м перамог трэцякурснік факультэта фізічнай культуры Аляксей Гаўрычэнка, а яго сакурснік Аляксандр Фешчанок заваяваў сярэбраную ўзнагароду ў бегу на 1000м.

**В.МАРЧАНКА.**

## ГУЛЬНУЛІ...



*Русская водка, что ты натворила? Русская водка, ты меня сгубила!*

Песня з рэпертуара В.Цыгановай, напэўна, магла гучаць 3 сакавіка 2001г. у пакоі 10-12 інтэрната № 4 нашага універсітэта. Імення ў той дзень дзевятнаццаць гадоў таму ўласным крыкам Сяргей Дзямчук (цяпер студэнт факультэта фізічнай культуры, гр. ФК-23) апавясціў Зямлю аб сваім нараджэнні.

З гэтай нагоды было прынята рашэнне адзначыць важную дату з шырокім размахам. І махавік падрыхтоўкі "мерапрыемства" закруціўся. На яго былі запрошаны А.Дзямчук, А.Давыдкоў, С.Давыдкоў, А.Васкевіч, М.Жамойцін, І.Грышчанка, В.Бейгул, Т.Сяўцова, А.Лаўда, М.Курзянкова, Е.Яськова, Н.Яськова, А.Палонскі, В.Чэкан — пераважна першакурснікі факультэта фізічнай культуры, гістарычнага, эканамічнага, матэматычнага і фізічнага факультэтаў. Адны з іх пяклі тарты, другія — рыхтавалі салаты, трэцяя — смажылі, чацвёртыя — парылі, пятыя — закупілі любімую гарэлачку. Адным словам, банкет павінен быў стаць грандыёзнай падзеяй у жыцці не толькі імянінніка, але і ўсіх запрошаных гасцей.

І ўсё скончылася б ціха, каб не адно "але". Не здолеў С.Дзямчук узгадаць тэкст вышэйназванай песні і прадбачыць вынікі застолля. Аднаму з гасцей, а іменна, Міхаілу Жамойціну так стала лёгка і радасна на душы за сябрука, што ён узляцеў да падлогі і ... абарваў пажарную сігналізацыю на адзінаццатым паверсе. Напэўна, Міхась забыў аб Дагаворы найму жылога памяшкання. А ў ім сказана, што калі не выяўлена асоба, якая нанесла ўрон, то за гэта нясуць калектыўную адказнасць усе жыхары.

Каб выявіць гэту "асобу", аддзелу выхаваўчай работы па пэўны час давялося стаць следчым органам.

Знікла з твару Міхася ўсмешка, калі ён даведаўся аб суме нанесенага ўрона. І тут, дзеля справядлівасці, варта адзначыць, што затраты на рамонтна-аднаўленчыя работы былі поўнасцю аплачаны яго бацькамі.

Ну, а ў той вечар пір працягваўся да чатырох гадзін раніцы. Вясёлая кампанія, гітара, спіртное — што яшчэ трэба! Але зноў такі гэтае "але". Рана ці позна даводзіцца адказваць за свае дзеянні і ўчынкі. **Загадам рэктара ўсе 15 студэнтаў выселены з інтэрната за грубае парушэнне яго Правілаў унутранага распарадку.**

**Г.ВАРОНІН, начальнік аддзела выхаваўчай работы.**

## УДАКЛАДНЕННЕ

У папярэднім нумары нашай газеты за 8 мая ў аб'яве аб конкурсе на замяшчэнне вакантнай пасады трэба чытаць: дацэнта па кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры.

Рэдакцыя просіць прабачэння за дапушчаную недакладнасць.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымліваліся даныя, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Песіна, 80, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71.

Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.

Тыраж 1.000 экз.

Заказ 290

Падпісана да друку 18.05.2001 г.